Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №4(49), 2008

*УДК 930(476):930(438):943.8:327(09)*

# Савецкая і польская міжваенныя гістарыяграфіі савецка-польскіх адносін у даследаваннях гісторыкаў СССР

М. М. Мязга

Гістарычная навука заўсёды была адным з важнейшых інструментаў у фарміраванні грамадскай думкі, нацыяльнай свядомасці. Асабліва вялікую ролю гістарычныя веды адыгрываюць пры фарміраванні знешнепалітычных канцэпцый той ці іншай краіны. Знешняя палітыка дзяржавы, каб быць паспяховай, павінна мець пад сабой трывалы гістарычны падмурак. З другога боку, знешнепалітычныя задачы, якія вырашае дзяржава, несумненна ўплываюць на стан гістарыяграфіі міжнародных адносін, якая развіваецца ў пэўнай краіне. На сённяшні дзень роля гісторыі ў названых грамадскіх працэсах, механізм узаемадзеяння паміж гісторыяй і знешняй палітыкай вывучаны яшчэ вельмі слаба. У прыватнасці, яшчэ не стала прадметам глыбокага даследавання гісторыкаў пытанне аб узаемным уплыве гістарыяграфіі польска-савецкіх адносін і рэальнага стану гэтых адносін у міжваенны час.

У дадзеным артыкуле мы паспрабуем вырашыць толькі частку шырокай даследніцкай задачы, якая заключаецца ў тым, каб прааналізаваць, наколькі савецкія гісторыкі звярнулі ўвагу ў сваіх даследаваннях на вызначэнне ролі гістарычнай навукі ў абгрунтаванні савецкай палітыкі ў дачыненні да Польшчы, і польскай у дачыненні да савецкай Расіі, а таксама, як стан савецка-польскіх адносін у міжваенны час уплываў на іх вывучэнне савецкімі і польскімі гісторыкамі ў той жа перыяд. Для гэтага нам неабходна перш за ўсё устанавіць, у якой ступені ў СССР увогуле былі вывучаны савецкая і польская гістарыяграфіі міжваеннага перыяду адносін паміж савецкай Расіяй і Польшчай. Мы паспрабуем высветліць, наколькі ў гістарыяграфічных даследаваннях савецкіх аўтараў прызнаецца ці адвяргаецца ўзаемны ўплыў гісторыі і знешняй палітыкі. У вызначэнні гэтай узаемасувязі заключаецца і практычная значымасць даследавання. Міжваенныя гады – гэта час, калі адбывалася станаўленне савецка-польскіх адносін і адпаведна толькі пачынала фарміравацца ў савецкай Расіі і Польшчы гістарыяграфія гэтых адносін. Адносіны паміж Масквою і Варшаваю ў міжваенныя гады былі пранізаны вострай канфрантацыйнасцю, што не магло не паўплываць на характар складваўшайся гістарыяграфіі дадзенай праблемы. У гэтай сувязі навуковы інтарэс уяўляе пытанне аб тым, наколькі адэкватна савецкія даследчыкі ацанілі ўплыў ідэйна-палітычных фактараў на развіццё савецкай і польскай гістарыяграфій і ў якой ступені яны прызналі аб’ектыўнай савецкую і польскую міжваенныя гістарыяграфіі адносін паміж СССР і Польшчай.

Традыцыйна гістарыяграфічны аналіз пачынаецца з характарыстыкі грамадскіх умоў развіцця гістарычнай навукі. Трэба адзначыць, што савецкія даследчыкі падыходзяць да гэтага пытання надзвычай аднабакова. Калі яны і спрабуюць ацаніць тыя ўмовы, у якіх развівалася савецкая гістарыяграфія ў 20 – 30-я гады XX ст., то гэтая ацэнка выглядае даволі павярхоўнай. Адзначаецца толькі тое, што ў выніку перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі адбыўся пераход савецкай гістарычнай навукі на пазіцыі марксісцка-ленінскай метадалогіі. Гэта, на думку савецкіх даследчыкаў, забяспечыла сапраўды навуковае даследаванне гістарычнага мінулага. Насамрэч грамадская рэчаіснасць СССР 20 – 30-х гадоў і яе ўплыў на развіццё гістарычнай навукі былі значна больш складанымі. Пераход усёй гістарычнай навукі на адны метадалагічныя прынцыпы зрабіў навуковае даследаванне па вялікаму рахунку практычна безальтэрнатыўным, аднанапраўленым. Усталяванне спачатку аўтарытарнага, а затым і таталітарнага рэжыму ў СССР вяло да падаўлення свабоды навуковай творчасці. Акрамя гэтых агульных фактараў, уплываўшых на развіццё гістарычнай навукі, меліся і больш вузкія, спецыфічныя фактары. На гэты конт арыгінальныя пагляды выказвае даследчык Р.Г. Піхоя. На яго

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

думку, савецкая ўлада, асабліва з 1930-х гадоў палічыла патрэбным актыўна выкарыстоўваць гістарычную навуку для абгрунтавання свайго гістарычнага права на месца ў гісторыі Расіі. Гістарычная навука з канца 1920-х гадоў павінна была абгрунтоўваць перамальнасць палітыкі царскай Расіі і Расіі савецкай, у тым ліку і палітыкі знешняй. [1, с. 41].

Грамадскія ўмовы, у якіх адбывалася фарміраванне польскай міжваеннай гістарыяграфіі, падаваліся савецкай гістарыяграфіяй з пункту гледжання класавай барацьбы. У якасці яскравага прыкладу такога падыходу можна назваць работу Л.А. Зашкільняка. Аўтар адзначае: "Рост рэвалюцыйнай барацьбы, накал класавых бітваў у многім вызначыў ідэйную атмасферу, у якой адбывалася фарміраванне грамадскіх навук у цэлым, у тым ліку гістарыяграфіі". Рэзка крытыкуючы палітычную сітсэму міжваеннай Польшчы, Л.А.Зашкільняк вымушаны ўсё ж прызнаць, што "аднаўленне незалежнасці стварыла больш спрыяльныя ўмовы для развіцця нацыянальнай культуры, навукі, у тым ліку і гістарычнай". [2, с. 52,53].

Савецкія гісторыкі разглядалі гістарыяграфічныя праблемы ў спецыяльных работах па гістарыяграфіі, а таксама гістарычныя працы па той ці іншай праблеме было прынята пачынаць з гістарыяграфічнага аналізу. Далей мы разгледзім найбольш важныя, на наш погляд, работы, якія адносяцца да абедзвюх груп з пункту гледжання даследавання ў іх стану савецкай і польскай міжваеннай гістарыяграфіі адносін паміж савецкай Расіяй і Польшчай.

Адразу пасля другой сусветнай вайны ў СССР выходзяць некалькі работ па гістарыяграфіі, у якіх яна падаецца перш за ўсё як поле ідэйна-палітычнай барацьбы. Да ліку такіх работ мы можам аднесці манаграфію Б.Е. Штейна "Буржуазные фальсіфікатары гісторыі (1919-1939)" [3] і калектыўную працу савецкіх гісторыкаў "Фальсіфікатары гісторыі" [4]. Абедзве названыя працы, асабліва апошняя, носяць больш публіцыстычны, чым навуковы характар. Пры гэтым аўтары канцэнтруюць сваю ўвагу на гістарыяграфіі вядучых краін Захаду і поўнасцю абыходзяць польскую гістарыяграфію. Што датычыцца савецкай гістарыяграфіі, то, як бачна ўжо з назваў работ, аўтары не ставілі сваёй мэтаю яе вывучэнне. Хаця, аналізуючы замежную гістарыяграфію, можна было прыбегнуць да яе параўнальнай характарыстыкі з савецкай, у тым ліку і ў плане вывучэння савецка-польскіх адносін.

Фундаментальным гістарыяграфічным даследаваннем савецкіх гісторыкаў стала пяцітомнае выданне "Нарысы гісторыі гістарычнай навукі ў СССР". Чацвёрты том гэтай працы прысвечаны развіццю савецкай гістарыяграфіі ў міжваенны час [5]. Дадзенае даследаванне носіць комплексны характар. Аўтары вывучаюць стан грамадскіх умоў, у якіх развівалася гістарычная навука, навуковыя ўстановы, якія займаліся гістарычнымі даследаваннямі, дасягненні ў вывучэнні разнастайных гістарычных праблем. Яны справядліва адзначаюць, што савецкая гістарыяграфія міжнародных адносін выступала перш за ўсё як інструмент ідэйна-палітычнай барацьбы. Для савецкіх гісторыкаў той эпохі "было характэрна асаблівае выкладанне знешняй палітыкі, у аснове якога ляжала імкненне выкрыць палітыку знешніх ворагаў СССР". Выкладанне пры гэтым характарызавалася беднасцю фактычнага матэрыялу [5, с. 514]. З гэтым тэзісам звязана і сцвярджэнне, якое ўтрымліваецца ў выданні, што працы савецкіх гісторыкаў па гісторыі міжнародных адносін у міжваенны час насілі публіцыстычны характар [5, с. 513]. У "Нарысах…" вялікая ўвага надаецца работам савецкіх і партыйных дзеячаў па пытаннях знешняй палітыкі. Адзначаецца, што "заснавальнікам знешняй палітыкі СССР, яе выдатным тэарэтыкам і кіраўніком, а таксама гісторыкам першых гадоў міжнароднай палітыкі сацыялістычнай дзяржавы быў У.І. Ленін". Як адзначаюць аўтары даследавання, у працах У. Леніна сфармуляваны асноўныя заканамернасці развіцця міжнародных адносін пры імперыялізме, утрымліваецца глыбокі аналіз міжнароднай абстаноўкі першых паслякастрычніцкіх гадоў [5, с. 502, 722].

У "Нарысах…" ёсць два параграфы, назва якіх мае на ўвазе даследаванне ў тым ліку і гістарыяграфіі польска-савецкіх адносін міжваеннага часу: "Распрацоўка пытанняў знешняй палітыкі СССР" і "Праблемы навейшай гісторыі ў савецкай гістарыяграфіі". Аднак іх аўтары канцэнтруюць сваю ўвагу галоўным чынам на выніках вывучэння савецкімі гісторыкамі 20 – 30-х гадоў адносін савецкай Расіі з вялікімі дзяржавамі і іх знешняй палітыкі. Пры гэтым гістарычныя работы, спецыяльна прысвечаныя знешняй палітыцы Польшчы і савецка-польскім адносінам не прыгадваюцца ўвогуле. Зразумець такое стаўленне да гістарыяграфіі менавіта поль-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ска-савецкіх адносін даволі цяжка, бо ў рабоце звяртаецца ўвага нават на работы па гісторыі адносін савецкай Расіі з краінамі, якім належала значна меншая роля ў савецкай знешняй палітыцы – Эстонія, Літва, Латвія [5, с. 517–518]. Калі гаворка ідзе пра абагульняючыя работы савецкіх аўтараў па праблемах міжнародных адносін, то аўтары "Нарысаў…" паказваюць, што галоўным чынам у гэтых работах аналізуюцца адносіны з вялікімі дзяржавамі [5, с. 729].

Такі ж падыход характэрны і пры ацэнцы гістарычных і публіцыстычных прац палітыкаў і дыпламатаў Савецкай Расіі. Так, пры аналізе работы Б. Штэрна, прысвечанай гісторыі Генуэзскай канферэнцыі 1922 г., складваецца ўражанне, што савецкі дыпламат не закранаў у ёй пытанне дзейнасці польскай дэлегацыі на канферэнцыі [5, с. 516 – 517]. Знаёмства ж са зместам работы дазваляе пераканацца ў адваротным. У дачыненні да работ У.Леніна назіраецца тая ж карціна. Агульна вядома, што многія работы, напісаныя кіраўніком савецкай Расіі, асабліва ў перыяд 1919 – 1921 гадоў, былі прысвечаны аналізу стану савецка-польскіх адносін. У "Нарысах…" жа не прагучала ацэнка ўкладу У. Леніна ў вывучэнне савецка-польскіх адносін на іх пачатковым этапе. Яго роля зводіцца толькі да вызначэння асноўных напрамкаў, па якіх савецкая гістарычная навука павінна "весці вывучэнне гісторыі міжнародных адносін" [5, с. 722].

У 1981 г. у СССР выходзіць грунтоўнае даведачнае выданне, прысвечанае гісторыі савецкага славяназнаўства [6]. У ім міжваенны перыяд у развіцці савецкага славяназнаўства характарызуецца як пачатковы этап. У рабоце ўказваецца, што вывучэнню менавіта гісторыі Польшчы на гэтым этапе савецкія гісторыкі надавалі найбольшае значэнне ў параўнанні з іншымі славянскімі краінамі. Праўда, аўтары выдання, указваючы на вялікую колькасць работ па гісторыі Польшчы, якія выйшлі ў СССР у 20 – 30-я гады XX ст., адзначаюць, што ў асноўным гэта былі "навукова-папулярныя артыкулы і брашуры, прысвечаныя тагачаснаму эканамічнаму і палітычнаму становішчу Польшчы, яе знешняй палітыцы…". З далейшага аналізу работ савецкіх гісторыкаў міжваеннага часу добра бачна, што яны сваю асноўную ўвагу канцэнтравалі на вывучэнні гісторыі класавай барацьбы, а гісторыя знешняй палітыкі Польшчы заставалася на другім плане [6, с. 12-14]. У бібліяграфічным спісе гісторыкаў-славістаў, які прыводзіцца ў рабоце, называюцца прозвішчы толькі двух савецкіх гісторыкаў-паланістаў міжваеннага часу А.І. Бортнікава і І.Д. Караюба. Першы з іх займаўся гісторыяй польска-рускіх рэвалюцыйных сувязей, другі – вывучаў савецка-польскія адносіны 1939-1945 гадоў. Тым самым аўтары выдання фактычна падводзяць нас да высновы, што ў 20 – 30-я гады XX ст. у СССР практычна не праводзіліся значныя даследаванні па гісторыі польска-савецкіх адносін перыяду ад першай да другой сусветнай вайны, з чым, на наш погляд, нельга пагадзіцца.

У значнай ступені абагульняючым даследаваннем па праблеме гістарыяграфіі гісторыі польска-савецкіх адносін для савецкай гістарыяграфіі з'яўляецца артыкул В.А. Дзьякава [7]. Аўтар вылучае тры закончаныя этапы ў даследаванні польскай гісторыі ў СССР. Першы этап ён вызначае як перадваенны з 1917 па 1941 г. Агляд гэтага этапу падаецца толькі ў самым агульным плане. В.А. Дзьякаў адзначае нешматлікасць савецкіх спецыялістаў па гісторыі Польшчы, стварэнне першых устаноў, якія займаліся польскай гісторыяй [7, с. 146-147]. Пры гэтым няма ніводнай спасылкі на работы савецкіх паланістаў, ні слова не сказана пра вывучэнне савецкай міжваеннай гістарыяграфіяй менавіта гісторыі савецка-польскіх адносін. В.А. Дзьякаў указвае, што савецкая гістарыяграфія па гісторыі міжваеннай Польшчы "адну са сваіх важнейшых задач бачыць у сістэматычнай і рознабаковай крытыцы буржуазна-нацыяналістычных і рэвізіяніcцкіх адзнак асноўных аспектаў палітыкі Другой Рэчы Паспалітай і яе санацыйных правіцелей на чале з Пілсудскім" [7, с. 156]. Але для пацверджання гэтага тэзісу аўтар звяртаецца толькі да пасляваеннай гістарыяграфіі і не прыгадвае ні адной работы міжваеннага часу. Калі ён канкрэтна гаворыць пра даследаванне знешней палітыкі Польшчы савецкімі гісторыкамі і адзначае тыя праблемы, якім даследчыкі надалі найбольш увагі, то зноў жа, спасылаецца толькі на пасляваенную савецкую гістарыяграфію [7, с.156-157, 158-159].

Спецыяльным даследаваннем па гісторыі польскай гістарычнай навукі з'яўляецца ўзгаданая ўжо праца Л.А. Зашкільняка [2]. Аўтар, разглядаючы даследаванне розных гістарычных праблем у польскай міжваеннай гістарыяграфіі, адзначае, што яна шмат увагі надавала вывучэнню і польска-савецкіх адносін. Цікавасць да гэтай праблемы, на яго думку,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

асабліва ўзмацнілася ў 1930-я гады ў сувязі з тым, што ўсходні напрамак стаў прыярытэтным у знешняй палітыцы "санацыі" [2, с.54].

Значнаю вехаю ў развіцці савецкай паланістыкі стаў выхад у 1950-я гг. трохтомнай гісторыі Польшчы [8]. Прасачыўшы асноўныя вехі польскай гісторыі, аўтары гэтай працы ўвогуле не спыніліся на пытаннях гістарыяграфіі.

У 1970-я гады савецкімі гісторыкамі было падрыхтавана да выдання два буйныя і змястоўныя ў навуковым плане зборнікі артыкулаў, прысвечаных гісторыі савецка-польскіх адносін [9, 10]. Сярод артыкулаў, змешчаных у зборніках, няма ніводнага, які быў бы прысвечаны вывучэнню міжваенных савецкай ці польскай гістарыяграфій адносін паміж СССР і Польшчай. Аўтары тых артыкулаў, якія ўвайшлі ў зборнік і якія прысвечаны гісторыі савецка-польскіх адносін перыяду 1918 – 1941 гадоў (П.Н. Альшанскі, І.В.Міхуціна), не даюць у іх характарыстыкі стану гістарыяграфіі праблемы ўвогуле. Калі ў артыкулах зборнікаў і маецца зварот да гістарыяграфічных праблем, то ён носіць самы агульны характар. Так, Ф.Г. Зуеў адзначае, што "да гэтага часу найменш распрацаваным застаецца пытанне аб савецка-польскіх адносінах напярэдадні і ў час еўрапейскага палітычнага крызісу 1938 г.". На думку аўтара, слаба вывучаны савецка-польскія адносіны ў сувязі з польска-літоўскім канфліктам. Пры гэтым ён вызначае асноўны краевугольны камень савецкай гістарыяграфіі савецка-польскіх адносін, адзначаючы, што савецкія даследчыкі падкрэслівалі антысавецкі характар палітыкі "правячай клікі "санацый". Гэтая палітыка прыкрывалася прынцыпам "раўнавагі" ў адносінах да суседзяў, які быў не чым іншым, як "спробай польска-германскай змовы, накіраванай супраць СССР [10, с. 207-209]. Пры гэтым Ф.Г. Зуеў не дае дэталізацыі гістарыяграфіі праблемы, не вылучае асобна гістарычныя даследаванні міжваеннага часу.

Традыцыйна аналіз гістарыяграфіі даецца ва ўводзінах да манаграфій. Аднак гэтага правіла савецкія гісторыкі прытрымліваліся далёка не заўсёды. Прыкладам могуць служыць работы В.Я. Сіпалса. У яго манаграфіі "Дыпламатычная барацьба напярэдадні другой сусветнай вайны" [11] аналіз гістарыяграфіі адсутнічае цалкам. У другой рабоце гэтага аўтара "Знешняя палітыка Савецкага Саюза. 1933 – 1935 гг." [12] прыгадваюцца толькі асобныя работы савецкіх гісторыкаў па гісторыі савецка-польскіх адносін, прычым усе яны адносяцца да пасляваеннай савецкай гістарыяграфіі. Аб міжваеннай гістарыяграфіі, як савецкай так, і польскай, аўтар увогуле не ўзгадвае.

Больш увагі аналізу гістарыяграфіі гісторыі савецка-польскіх адносін удзяліла І.В.Міхуціна. Уводзіны яе манаграфіі "Савецка-польскія адносіны 1931 – 1935" утрымліваюць дастаткова падрабязны агляд як савецкай, так і польскай гістарыяграфіі. Але, зноў жа, аўтар акцэнтуе ўвагу на дасягненнях савецкай і польскай гістарыяграфіі, пачынаючы з часоў другой сусветнай вайны. Гістарыяграфію міжваеннага часу яна не палічыла неабходным зрабіць аб'ектам свайго даследавання. Хаця і адзначае пры аналізе польскай эміграцкай гістарыяграфіі пасля другой сусветнай вайны, што яна працягвала гістарыяграфічныя традыцыі міжваеннага часу [13].

Бадай што найбольш грунтоўны аналіз гістарыяграфіі савецка-польскіх адносін зрабіў у сваёй манаграфіі П.Н. Альшанскі [14]. Аднак, і ён зноў жа акцэнтуе ўвагу на пасляваеннай гістарыяграфіі. У дачыненні да даваеннай гістарыяграфіі П.Н. Альшанскі адзначае, што ў ёй пытанні савецка-польскіх адносін не атрымалі шырокага асвятлення. На думку аўтара, аб іх толькі "коратка гаварылася ў асноўным у агульных работах па гісторыі знешняй палітыкі СССР і ў нешматлікіх часопісных публікацыях". Падсумоўваючы, П.Н. Альшанскі піша: "Сістэматычнае вывучэнне гісторыі адносін паміж СССР і Польшчаю пачалося ўжо ў пасляваенны час" [14, с. 6-7].

У тых выпадках, калі савецкія гісторыкі звярталіся да вывучэння адносін Польшчы з іншымі дзяржавамі ў міжваенны час, яны ўсё роўна закраналі і праблемы савецка-польскіх адносін, лічачы, што іх стан у многім вызначаў знешнюю палітыку Польшчы ў цэлым. Яскравым прыкладам такой работы з'яўляецца манаграфія Д.С. Клімоўскага "Германія і Польшча ў Лакарнскай сістэме еўрапейскіх адносін" [15]. У пачатку сваёй работы Д.С.Клімоўскі звяртаецца да характарыстыкі гістарыяграфіі праблемы. У дачыненні да савецкай міжваеннай гістарыяграфіі савецка-польскіх адносін ён абмяжоўваецца толькі заўвагай, што вялікую

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

каштоўнасць маюць назіранні савецкіх гісторыкаў той эпохі за тым, як польскія гісторыкі прыстасоўваліся да змен знешнепалітычнага курса свайго ўрада [15, с. 12]. Гэтай жа фразай вычэрпваецца і аналіз польскай міжваеннай гістарыяграфіі, бо далей аўтар гаворыць пра польскую эміграцкую гістарыяграфію пасля другой сусветнай вайны і гістарыяграфію ПНР.

У калектыўных працах савецкіх гісторыкаў, прысвечаных знешняй палітыцы СССР у цэлым, не звярталася належная ўвага на гістарыяграфічны аспект праблемы. У рабоце "Барацьба СССР за мір і бяспеку народаў. Гістарычны вопыт" [16] няма ніводнага гістарыяграфічнага артыкула, а ў артыкулах, якія прысвечаны канкрэтным гістарычным праблемам, адсутнічае агляд гістарыяграфіі па іх. У такіх публікацыях, як "Гісторыя дыпламатыі" [17], "Гісторыя знешняй палітыкі СССР" розных гадоў выдання [18] таксама адсутнічаюць раздзелы, прысвечаныя гістарыяграфічнаму аналізу.

Вядома, прыведзены пералік гістарычных работ, на аснове аналізу якіх мы маглі б ацаніць грунтоўнасць даследавання савецкімі гісторыкамі савецкай і польскай міжваенных гістарыяграфій адносін паміж Польшчай і СССР, далёка не поўны. Мы адабралі тыя работы, якія ўяўляюцца найбольш тыповымі для вывучэння азначанай праблемы. Знаёмства з работамі савецкіх гісторыкаў дае падставы зрабіць выснову, што яны не ажыццявілі грунтоўнага даследавання гістарыяграфіі гісторыі савецка-польскіх адносін. Пры гэтым савецкая міжваенная гістарыяграфія гэтай праблемы практычна ўвогуле не была прадметам даследавання ў савецкі час. Дадзены тэзіс у яшчэ большай меры адносіцца і да вывучэння польскай гістарыяграфіі міжваеннага часу.

Такую пазіцыю савецкіх гісторыкаў нельга растлумачыць тым, што ў міжваенны час савецкія і польскія гісторыкі мала займаліся гісторыяй польска-савецкіх адносін. Да пытанняў станаўлення і развіцця ў міжваенны час савецка-польскіх адносін рэгулярна звярталіся буйныя дзеячы савецкай дзяржавы. Паколькі іх работы заклалі канцэптуальныя асновы развіцця савецкай гістарыяграфіі, то яе вывучэнне, на наш погляд, трэба пачынаць з аналізу работ дзеячаў бальшавіцкай партыі і савецкай дзяржавы, у якіх яны звяртаюцца да гісторыі савецка-польскіх адносін. Савецкая гістарыяграфія развівалася пад вызначальным уплывам афіцыйных установак правячай партыі і савецкай дзяржавы. Таму без знаёмства з работамі савецкіх і партыйных дзеячаў немагчыма зразумець яе ідэйна-палітычную і метадалагічную асновы. У першую чаргу – гэта работы У. Леніна. Найбольш грунтоўную характарыстыку асноўных прынцыпаў савецкай палітыкі ў дачыненні да Польшчы У. Ленін даў у такіх работах, як "Палітычная справаздача ЦК РКП(б) на ІХ Усерасійскай канферэнцыі УКП(б) 22 верасня 1920 г." [19] і ў "Прамове на з'ездзе рабочых і служачых скураснай вытворчасці 2 кастрычніка 1920 г." [20]. Да асобных праблем савецка-польскіх адносін У.Ленін звяртаецца і ў іншых сваіх работах. Яго высновы аб агрэсіўнасці "буржуазна-памешчыцкай Польшчы" ў дачыненні да савецкай Расіі, аб тым, што Польшча з'яўлялася краевугольны каменем Версальскай сістэмы сталі асноваю для развіцця савецкай гістарыяграфіі савецка-польскіх адносін міжваеннага часу. Савецкія гісторыкі міжваеннага часу ў сваіх даследаваннях гісторыі савецка-польскіх адносін абапіраліся на працы і іншых кіраўнікоў савецкай дзяржавы: І. Сталіна, Г. Чычэрына, Б. Штэйна, А. Іофе.

Польскія палітыкі і дыпламаты міжваеннага часу таксама пакінулі вялікую колькасць работ, прысвечаных гісторыі знешняй палітыкі сваёй краіны 20 – 30-х гадоў ХХ ст., у прыватнасці, польска-савецкіх адносін. Гэта работы Ю. Пілсудскага, С. Грабскага, Р.Дмоўскага, А. Скшыньскага, У. Сікорскага. На тыя ацэнкі характару і стану савецка-польскіх адносін, якія былі выказаны ў гэтых работах, у многім абапіралася польская гістарыяграфія.

Уяўляецца неабгрунтаваным тэзіс некаторых савецкіх гісторыкаў аб тым, што рэальнае вывучэнне гісторыі савецка-польскіх адносін міжваеннага часу пачалося ў СССР толькі пасля другой сусветнай вайны. Ужо ў 1920-я гады ў савецкай Расіі з'яўляюцца гістарычныя работы, прысвечаныя гісторыі савецка-польскіх адносін, якія безумоўна заслугоўваюць увагі даследчыкаў гістарыяграфіі гэтай праблемы. Гэта працы С. Гесена [21], Ф. Кона [22], С. Петрухіна [23], Я. Радапольскага [24], якія непасрэдна прысвечаны знешняй палітыцы Польшчы. У наступнае дзесяцігоддзе савецкая паланістыка працягвала актыўна развівацца. Былі апублікаваны даследаванні Ю. Браткоўскага [25], М. Віслінскага [26], А.Валынскага [27], А. Врублеўскага [28],

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

І. Высоцкага [29], у якіх даследавалася знешняя палітыка Польшчы, а ў якасці яе важнейшага элемента разглядаліся польска-савецкія адносіны. Польскі напрамак савецкай знешняй палітыкі займаў важнае месца ў абагульняючых працах па гісторыі міжнародных адносін, выдадзеных у СССР у міжваенны час [30, 31]. Напрацоўні савецкіх гісторыкаў міжваеннага часу сталі базай для выдання абагульняючай працы "Гісторыя дыпламатыі", у трэцім томе якой значнае месца адведзена гісторыі савецка-польскіх адносін у міжваенны час [32].

Фарміраванне польскай гістарыяграфіі савецка-польскіх адносін, на наш погляд, адбывалася яшчэ больш актыўна, чым савецкай. Ужо ў час польска-савецкай вайны 1919 – 1920 гадоў у Польшчы былі выдадзены працы, аўтары якіх рабілі агляд першых крокаў у станаўленні адносін паміж Савецкай Расіяй і Польшчай і спрабавалі з гістарычнага пункту гледжання абгрунтаваць прэтэнзіі Польшчы на землі на ўсходзе, якія не з'яўляліся этнічна польскімі [33]. Безумоўна, гэтыя работы насілі больш публіцыстычны характар. У далейшым колькасць работ польскіх аўтараў па гісторыі савецка-польскіх адносін, як і іх навуковы ўзровень, будуць расці. Высокім узроўнем даследавання знешняй палітыкі Польшчы вызначаліся работы Ю. Гжымала-Грабавецкага [34], К. Куманецкага [35], С. Кучэбы [36]. У польскай гістарыяграфіі ў 20 – 30-я гады ХХ ст. ужо сфарміравалася і асноўная канцэпцыя гісторыі савецка-польскіх адносін міжваеннага часу – канцэпцыя "двух ворагаў".

Такім чынам, савецкая і польская гістарыяграфіі міжваеннага часу ўяўляюць сабою маладаследаваную гісторыкамі СССР навуковую праблему. Прычым, улічваючы ролю гістарыяграфіі ў фарміраванні грамадскай свядомасці і ў той ідэйна-палітычнай барацьбе, якая адбывалася паміж савецкай Расіяй і Польшчай у перыяд ад першай да другой сусветнай войны, указаная праблема мае высокую ступень актуальнасці.

**Abstract.** The paper considers the degree of the investigation of the Soviet and Polish historiographies of the relations between the Soviet Russia and Poland in 1918-1941 as one of the factors influencing foreign policy and, at the same time, dependent on it. The analysis of the given works allows to draw a conclusion that historians of the USSR studied the Soviet historiography of the Soviet -Polish relations of the interwar period extremely superficially. As for the Polish historiography of this problem, it was not practically the object of scientific research for the historians of the USSR.

### Літаратура

1. Пихоя, Р.Г. Восстребованная временем история. Отечественная историческая наука в 20 – 30-е годы ХХ века / Р.Г. Пихоя // Новая и новейшая история. – 2004. – №2. – 28-53

2. Зашкильняк, Л.А. Формирование и развитие исторической науки в Польше / Л.А. Зашкильняк. – Львов: ЛГУ, 1986. – 82 с.

3. Штейн, Б.Е. Буржуазные фальсификатары истории (1919 – 1939) / Б.Е.Штейн. – М.: Госполитиздат, 1951. – 288 с.

4. Фальсификатары истории . – М.: Госполитиздат, 1948. – 72 с.

5. Очерки истории исторической науки в СССР . В 5 т. – М.: Наука, 1966. – Т.4. – 854 с.

6. Историки-слависты СССР. Библиографический словарь-справочник . – М.: Наука, 1981. – 204 с.

7. Дьяков, В.А. Изучение истории Польши советскими учеными / В.А. Дьяков // Новая и новейшая история. – 1985. – № 6. – С. 146-160.

8. История Польши . – В 3 т. Т.3. – М., Наука, 1958. – 667 с.

9. Очерки истории советско-польских отношений 1917 – 1977 . – М.: Наука, 1979. – 582 с.

10. Советско-польские отношения. 1918 – 1945 . – М.: Наука, 1974. – 296 с.

11. Сиполс, В.Я. Дипломатическая борьба накануне второй мировой вайны / В.Я. Сиполс. – М.: Наука, 1989. – 335 с.

12. Сиполс, В.Я. Внешняя палитика Советского Союза. 1933-1935 гг. / В.Я.Сиполс. – М.,: Наука, 1988. – 391 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

13. Михутина, И.В. Советско-польские отношения. 1931-1935 / И.В.Михутина. – М.: Наука, 1977. – 288 с.

14. Ольшанский, П.Н. Рижский договор и развитие советско-польских отношений. 1921 – 1924 / П.Н. Ольшанский. – М.: Наука, 1974. – 288 с.

15. Климовский, Д.С. Германия и Польша в Локарнской системе европейских отношений / Д.С. Климовский. – Мн.: Изд. БГУ, 1975. – 288 с.

16. Борьба СССР за мир и безопасность народов. Исторический опыт . – М.: Межд.отн., 1984 – 389 с.

17. История дипломатии . – В 3 т. Т. 3. – М.: Политиздат, 1965. – 684 с.

18. История внешней политики СССР 1917 – 1985. – В 2 т. Т.1 . – М.: Наука, 1986. – 546 с.

19. Ленин, В.И. Политический отчет ЦК РКП(б) на IX Всеросийской конференции РКП(б) 22 сентября 1920 г. / В.И. Ленин // Полн. собр. соч. – Т.41.

20. Ленин, В.И. Речь на съезде рабочих и служащих кожевенного производства 2 октября 1920 г. / В.И. Ленин // Полн. собр. соч. – Т. 41.

21. Гессен, С.Я. Окраинные государства: Польша, Финляндия, Эстония, Латвия, Литва / С.Я. Гессен. – М.: Прибой, 1925. – 150 с.

22. Кон, Ф. Современная Польша / Ф. Кон. – М.: Главполитпросвет, 1924. – 49 с.

23. Петрухин, С. Как Польша готовится к войне / С. Петрухин. – М.: Гос. воен. издат., 1926. – 32 с.

24. Радопольский, Я. Польша готовится к войне / Я. Радопольский. – М. – Л.: Госиздат, 1929. – 123 с.

25. Братковский, Ю. Польско-германские противоречия и угроза антисоветской интервенции / Ю. Братковский // Коммунистический Интернационал. – 1933 – №21, 20 июня. – С. 35 – 41.

26. Вислинский, М. Внешняя политика Польши на современном этапе / М.Вислинский // Пропагандист. – 1935. – №10. – с. 42 – 47.

27. Волынский, А. Антисоветский союз шести: Франция и её союзники / А.Волынский. – М., Политиздат, 1932. – 39 с.

28. Врублевский, А. Польша / А. Врублевский. – М.: Соцэкгиз, 1936. – 211 с.

29. Высоцкий, И. Внешняя политика фашистской Польши / И. Высоцкий // Коммунистический Интернационал. – 1935 – №18. – с. 10 – 17.

30. Иванов, Л.Н. Мировая политика после Версаля / Л.Н. Иванов. – М.: Московский рабочий, 1928. – 112 с.

31. Ерусалимский, А.С. Германия, антанта и СССР / А.С. Ерусалимский. – М.: Изд. Ком. Академ., 1928. – 322 с.

32. История дипломатии. – В 5 т. Т. 3. – М.: ОГИЗ, 1945. – 643 с.

33. Kalinowski, W. Kwestja wshodnia a Bialorus / W. Kalinowski. – Warszawa: Druk. Lit., 1920. – 14 s.

34. Grzymała-Grabowiecki, J. Polityka zagraniczna Polska w roku 1924 / J.Grzymała-Grabowiecki. – Warszawa.: F. Hoesick, 1925. – 73 s.

35. Kumaniecki, K. Odbudowa panstwowości Polskiej / K. Kumaniecki. – Warszawa – Krakow: J. Czernecki, 1924. – 787 s.

36. Kutszeba, S. Nasza polityka zagraniczna / S. Kutszeba. – Kraków: W-wo Skoły ludowej, 1923. – 120 s.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 15.10.07

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ